УДК 94(476)+504

Я. І. ЗАВАЦКІ

**ЗАБРУДЖВАННЕ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ БССР У ЧАСЫ ПЕРАБУДОВЫ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ДЗЕЙНАСЦІ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ АСІПОВІЦКАГА РАЁНА МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ)**

*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*zawadzki1996jauhien@mail.ru*

*У артыкуле разглядаецца праблема ўплыву калгасаў і саўгасаў Асіповіцкага раёна БССР на прыроду на мяжы 1980 – 1990-х гг. у перыяд перабудовы. Робіцца выснова, што сельскагаспадарчыя прадпрыемствы даследуемага раёна ў значнай ступені аказвалі негатыўнае ўздзеянне на прыроду, што тлумачыцца невыкананнем рэкамендаванай тэхналогіі пры хімізацыі сельскай гаспадаркі і нізкай экалагічнай культурай гаспадарчых кіраўнікоў.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У 1960 – 1980-я гг. эканамічнае развіццё БССР характарызавалася паглыбленай інтэнсіфікацыяй сельскай гаспадаркі, што праявілася ў больш шырокім ажыццяўленні яе складнікаў – комплекснай механізацыі, меліярацыі і хімізацыі [1]. Аднак іх правядзенне не заўсёды было экалагічна абгрунтаваным; у прыватнасці, шырокамаштабная хімізацыя прывяла да знішчэння мікраарганізмаў, за кошт якіх забяспечвалася ўрадлівасць глебы [2, 3].

Новы этап ажыццяўлення савецкай аграрнай і прыродаахоўнай палітыкі наступіў у 1985 г. у сувязі з прыходам да ўлады М. Гарбачова і пачаткам разгортвання працэсаў перабудовы. Комплексны вектар гэтай палітыкі быў закладзены ў 1986 г. на XXVII з’ездзе КПСС, у ходзе працы якога былі прыняты Асноўныя накірункі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986 – 1990 гады і на перыяд да 2000 года. Раздзел VI Асноўных накірункаў, прысвечаны пытанням развіцця аграпрамысловага комплексу, прадугледжваў паслядоўнае засваенне навукова абгрунтаваных сістэм вядзення гаспадаркі, рост прымянення глебаабарончых метадаў апрацоўкі глебы і правядзенне супрацьэразійных захадаў. Акрамя гэтага, ставілася задача палепшыць ахову і павысіць эфектыўнасць прымянення ўгнаенняў. У сваю чаргу, раздзел XI Асноўных накірункаў, дзе закраналася праблема аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў, дэклараваў узмацненне экалагічных захадаў, у прыватнасці больш шырокае ўкараненне прагрэсіўных тэхналагічных працэсаў. Іх прымяненне дазволіла б забяспечыць поўнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў, сыравіны і матэрыялаў, якія выключалі ці істотна паніжалі адмоўнае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе [4].

Выбар аб’екта даследавання абумоўлены тым, што Асіповіцкі раён БССР з’яўляўся адным з буйнейшых прамысловых цэнтраў Магілёўскай вобласці, на тэрыторыі якога размяшчаліся значныя лясныя (55 % ад агульнай плошчы) і водныя (тры вялікія ракі – Бярэзіна, Свіслач і Пціч) рэсурсы, што не магло не адкласці істотны адбітак на стан навакольнага асяроддзя.

У разглядаемым раёне ў перыяд перабудовы праводзілася пэўная работа па аздараўленні навакольнага асяроддзя. На прадпрыемствах і ў арганізацыях распрацоўваліся як гадавыя прыродаахоўныя мерапрыемствы, так і доўгатэрміновая праграма «Экалогія», прымаўся шэраг рашэнняў выканкамамі і сесіямі гарадскога і раённага Саветаў народных дэпутатаў па дадзеным пытанні. Аднак выкананне ўсіх дакументаў ішло нездавальняюча, што адзначалася ў верасні 1989 г. у дакладзе раённага Савета народных дэпутатаў старшынёй выканкама Л. Крамінкіным і ў выступах камуністаў на сходзе партыйнай арганізацыі гарвыканкама. Аб адмоўным уплыве жыхароў горада і раёна на стан навакольнага асяроддзя сведчылі два выпадкі грубага парушэння прыродаахоўнага заканадаўства. У маі 1989 г. калгас «Чырвоны ўдарнік» і саўгасы «Каўгарскі» і «Асіповіцкі» прымянілі авіяцыю для ўнясення ядахімікатаў у водаахоўных зонах. Аперацыя «Чыстае паветра», праведзеная ў чэрвені таго ж года, выявіла, што 43 адсоткі аўтатранспартных сродкаў перавысілі ўтрыманне вокісу вугляроду ў адпрацаваных газах. Усяго за 9 месяцаў 1989 г. было складзена 39 актаў па фактах парушэння прыродаахоўнага заканадаўства, звыш 40 чалавек было прыцягнута да адміністрацыйнай адказнасці, 17 чалавек атрымалі штраф на агульную суму 470 рублёў. Тым не менш, нягледзячы на прынятыя захады, выпадкі парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства працягвалі здарацца [5]. Справа ў тым, што прадпрыемствам – з п.гл. гаспадарчых інтарэсаў – устрыманне ад забруджвання навакольнага асяроддзя не было выгадным, бо эканомія шматкампанентнай сыравіны часта пераўзыходзіла суму штрафаў.

Летам 1990 г. была праведзена раённая праверка па выкананні прыродаахоўнага і зямельнага заканадаўстваў сумесна з санітарным урачом па камунальнай гігіене К. Рак і дзяржінспектарам па ахове прыроды У. Пчалінцавым. Бераг р. Бярэзіна, каля якога размяшчаўся калгас «Беларусь», на тэрыторыі калгаснага склада гаруча-змазачных матэрыялаў быў засмечаны старымі аўтамабільнымі сцёкамі, поліэтыленавай плёнкай, металаломам. Да таго ж былі заўважны сляды зліву сцёкавых вод і хімічных угнаенняў, а тэрыторыя склада была забруджана нафтапрадуктамі. Ёмістасці для захавання аміячнай вады

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і вадкіх комплексных угнаенняў знаходзіліся прыблізна ў сотні метраў ад гэтага склада і працякалі. Усе калгасныя склады і ёмістасці размяшчаліся ў водаахоўнай зоне ракі і забруджвалі саму Бярэзіну.

Такім чынам, кіраўніцтва гаспадаркі не выконвала рашэнне райвыканкама ад 30 ліпеня 1985 г. «Аб замацаванні за калгасамі і саўгасамі ўчасткаў малых рэк раёна» і пастанову ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР ад 11 снежня 1980 г. «Аб узмацненні аховы малых рэк ад забруджвання, засмечвання і выдаткавання і аб рацыянальным выкарыстанні іх водных рэсурсаў».

Пры аглядзе машыннага двара ў в. Краснае былі добра заўважны ўчасткі тэрыторыі, забруджаныя маслам, іншымі нафтапрадуктамі. Пункт мыйкі сельскагаспадарчай тэхнікі, які знаходзіўся ў гаспадарцы, не быў абсталяваны сістэмай зваротнага водазабеспячэння, не меў сістэмы ачысткі вады ад нафтапрадуктаў, мыццё тэхнікі ажыццяўлялася пітной вадой. Выкарыстаная вада збіралася ў адстойніку, вывозілася ў неачышчаным стане і вылівалася ў кар'ер.

Да падобных фактаў далучаліся парушэнні зямельнага заканадаўства. Напрыклад, у в. Краснае пры будаўніцтве жылых дамоў знімаўся ўрадлівы слой зямлі. У сваю чаргу, у калгасе Валадарскага не выконваліся мерапрыемствы па ахове прыроды, зацверджаныя рашэннем раённага Савета народных дэпутатаў ад 23 сакавіка 1984 г., актам-прадпісаннем ад 25 жніўня 1989 г. гаррайінспекцыі па ахове прыроды. На тэрыторыі свінафермы ў в. Ліпень не былі пабудаваны бетонныя жыжказборнікі, і гноевая жыжка разлівалася па сельскагаспадарчых угоддзях, забруджваючы наваколле.

Пры аглядзе мыйкі сельскагаспадарчай тэхнікі ў Ліпені было выяўлена, што ў гаспадарцы адсутнічалі склад мінеральных угнаенняў, пункты хімічнага пратраўлівання насення і пляцоўкі для абясшкоджвання тэхнікі пасля работы з ядахімікатамі. На той жа свінаферме водазабор меў агароджу, але вароты не былі навешаны, і на яго тэрыторыі мылася тэхніка. Побач размяшчаліся сіласныя ямы. Адсутнічаў на ферме і жывёла-могільнік. Трупы мёртвых жывёл выкідваліся ў ямы, выкапаныя на забалочаных участках. Падобнае гаспадаранне прыводзіла да забруджвання грунтовых вод, земляў, вяло да антысанітарнага стану тэрыторыі [6].

З мэтай выканання належных захадаў, звязаных з пераадоленнем негатыўнага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе, 29 сакавіка 1989 г. на восьмай сесіі раённага Савета народных дэпутатаў ХХ склікання было прынята рашэнне «Аб задачах савецкіх і гаспадарчых органаў раёна па забеспячэнні прыродаахоўнага заканадаўства і паляпшэнні экалагічнай абстаноўкі ў раёне». Восенню 1990 г. ход выканання гэтага рашэння стаў прадметам разгляду на трэцяй сесіі раённага Савета народных дэпутатаў ХХІ склікання. Па адзначанай праблеме слова ўзяў сакратар пастаяннай камісіі па экалогіі і ліквідацыі вынікаў чарнобыльскай аварыі А. Мірашнічэнка.

Ён адзначыў, што ў адпаведнасці з данымі санітарна-эпідэміялагічнай станцыі, даследаванні якасці пітной вады з шахтных калодзезяў у в. Пратасевічы і Паплавы паказвалі яе істотнае пагаршэнне за апошнія два гады. Так, у 1988 г. з шасці проб павышанае ўтрыманне нітратаў было выяўлена ў адной, а ў 1990 г. з чатырнаццаці проб – усе з павышаным утрыманнем нітратаў. Меркавалася, што крыніцай забруджвання грунтовых вод з'яўлялася няправільнае захаванне мінеральных угнаенняў і забруджванне механічных двароў.

З моманту рашэння сесіі, прынятага 29 сакавіка 1989 г., былі здадзены ў эксплуатацыю ачышчальныя збудаванні ў п. Сасновым, была пабудавана біятэрмічная яма для пахавання трупаў жывёлы, быў узведзены жыжказборнік у калгасе імя Леніна ў в. Ясень.

Пры гэтым кіраўніцтва раённага аграпрамысловага аб'яднання пусціла на самацёк рашэнне многіх прыродаахоўных праблем. У дадзенага аб'яднання не мелася сістэма разгляду экалагічных пытанняў на сваіх жа паседжаннях, адсутнічаў кантроль над выкананнем сваіх жа загадаў. Трэба адзначыць, што падобная сітуацыя была характэрная і для рэспублікі ў цэлым, бо на той час адсутнічалі спецыялісты, якія маглі прымаць экалагічна кампетэнтныя рашэнні ў галіне прыродакарыстання. Нягледзячы на тое, што загад

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

№15 ад 12 красавіка 1990 г. «Аб спецыяльным водакарыстанні ў калгасах і саўгасах раёна» прадугледжваў выкананне кіраўнікамі гаспадарак цэлага комплексу мерапрыемстваў, уключаючы афармленне дазволу на спецводакарыстанне да 1 чэрвеня 1990 г., тэрмін прайшоў, а мерапрыемствы дагэтуль не былі ажыццёўлены.

Нездавальняючай з’яўлялася сітуацыя і па праблемах аховы зямлі. У прыватнасці, кіраўнікамі такіх гаспадарак, як аграгандлёвае прадпрыемства «Пратасевічы», калгас «Авангард», не вырашалася пытанне захавання мінеральных угнаенняў, каб яны не пранікнулі ў глебу.

Акрамя гэтага, на свінаферме ў Ліпені гноевая жыжка разлівалася да лесу. Пры гэтым, хаця водазабор быў агароджаны, там адсутнічалі вароты, у сувязі з чым на яго тэрыторыі мылася любая тэхніка. Адсутнічаў на ферме і могільнік для жывёлы [7].

Праверка выканання прыродаахоўнага заканадаўства і мерапрыемстваў па ахове прыроды, зацверджаных рашэннем сесіі раённага Савета народных дэпутатаў у сакавіку 1989 г., была ажыццёўлена гаррайінспекцыяй па экалогіі ў калгасе «Беларусь» у лютым 1991 г. Падчас праверкі выявілася, што большасць прадугледжаных мерапрыемстваў не было выканана дагэтуль, нягледзячы на даўняе сканчэнне іх тэрмінаў. Не прымалася ніякіх захадаў па вынасе складу гаруча-змазачных матэрыялаў і ёмістасцей для захавання аміячнай вады і вадкіх комплексных угнаенняў за тэрыторыю водаахоўнай зоны р. Бярэзіны. Пойма ракі заставалася забруджанай, не будаваўся бетанаваны жыжказборнік побач са старым памяшканнем на свінаферме ў в. Кассё. Жыжка расцякалася на прылеглай мясцовасці, забруджваючы землі і грунтовыя воды. Гэта плошча зарасла пустазеллем і фактычна сышла з сельгаскарыстання. Пабудаваны жыжказборнік побач з новым памяшканнем свінафермы не меў гідраізаляцыі. Мыечная эстакада не абсталёўвалася ачышчальнымі збудаваннямі і зваротным водазабеспячэннем, а для мыцця тэхнікі выкарыстоўвалася пітная вада. З-за адсутнасці аўтаматыкі на воданапорных вежах вада перапаўнялася і вылівалася на зямлю.

Старшыня праўлення калгаса «Беларусь» А. Германчук прыняў рашэнне аб самавольнай распрацоўцы кар’ера ў прыбярэжнай зоне р. Бярэзіны, што парушала зямельны і водны кодэксы БССР. У выніку інспекцыя па экалогіі на старшыню праўлення гаспадаркі склала пратакол і выпісала пастанову на 100 рублёў штрафу.

У той ці іншай ступені адзначаныя парушэнні экалагічнага заканадаўства характэрныя і для іншых гаспадарак. Тыповым з’яўлялася і непрыняцце захадаў па выкананні рашэння райвыканкама аб праектах водаахоўных зон і прыбярэжных палос малых рэк. Ніводная гаспадарка не вырабіла аншлагі для абазначэння межаў прыбярэжных палос [8].

Следствам невыканання прыродаахоўных мерапрыемстваў, прадугледжаных рашэннямі мясцовых органаў улады, а таксама правілаў захавання мінеральных угнаенняў, стала экалагічнае бедства каля в. Орча, якое здарылася 25 лістапада 1991 г. У водаахоўнай зоне безыменнай рачулкі адбыўся разрыў ёмістасці, запоўненай аміячнай вадой, у выніку чаго ў навакольнае асяроддзе вылілася 12 кубічных метраў гэтай вадкасці. Глеба, грунтовыя і падземныя воды, паветра аказаліся забруджаныя ёй. Па факце парушэння экалагічнага заканадаўства гаррайінспекцыя прыняла захады ўздзеяння на адказных асоб калгаса «Авангард».

Між-іншым, ажыццяўляючы мерапрыемствы, неабходна было: правесці абвалаванне ёмістасцей для захавання вадкіх угнаенняў, усталяваць іх на надзейнай цаглянай ці бетоннай аснове, вынесці ёмістасці, размешчаныя каля рэк, за 500 метраў ад межаў водаахоўнай зоны.

Са сканчэннем усіх усталяваных тэрмінаў кіраўнікі нават не пачалі выконваць запланаваныя мерапрыемствы. Праблема іх выканання выносілася на выканкамы і сесіі раённага Савета народных дэпутатаў. Кіраўнікам райсельгасхіміі выказваліся папярэджанні, каб ёмістасці, які не адпавядалі патрабаванням, не запраўляліся вадкімі ўгнаеннямі да ўстаранення недахопаў. Напярэдадні агранамічная служба ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання, кіраўнікі гаспадарак пераконвалі гаррайінспекцыю па экалогіі, што аміячная вада больш не будзе выкарыстоўвацца ў якасці ўгнаення, і ёмістасці ёй запаўняцца не будуць [9].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Нягледзячы на нядбайнае выкананне шматлікімі калгасамі і саўгасамі Асіповіцкага раёна мерапрыемстваў па ахове прыроды, у гэтай справе меліся і пэўныя поспехі. Так, паводле вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва за 1989 г., калгас «Новы шлях» быў прызнаны пераможцам сярод сельскагаспадарчых прадпрыемстваў раёна. У гаспадарцы быў абвалаваны склад гаруча-змазачных матэрыялаў, былі вынесены з водаахоўнай зоны малых рэчак ёмістасці для аміячнай вады, была пабудавана біятэрмічная яма, будаваўся склад мінеральных угнаенняў. Была распрацавана комплексная доўгатэрміновая праграма аховы навакольнага асяроддзя на 1991–1995 гады і на перспектыву да 2000 года «Экалогія». Калектыву калгаса «Новы шлях» быў уручаны пераходны Чырвоны сцяг раённага Савета народных дэпутатаў [10].

Аналіз развіцця аграпрамысловага комплексу Асіповіцкага раёна БССР на мяжы 1980 – 1990-х гг. паказаў, што дзяржаўная палітыка, якая прадугледжвала пераадоленне ці ў горшым выпадку мінімізацыю адмоўнага ўплыву сельскай гаспадаркі на прыроду ажыццяўлялася з вялікімі цяжкасцямі, а яе рэалізацыя па вялікім рахунку не адпавядала адпаведным палажэнням Асноўных накірункаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986 – 1990 гады і на перыяд да 2000 года. Тлумачэнне трэба шукаць у тым, што многія гаспадаркі ставілі перад сабой адну мэту – атрыманне як мага больш высокіх ураджаяў, дзеля чаго прымянялі ўсе наяўныя сродкі: моцную энерганасычаную тэхніку, меліярацыю, хімізацыю земляробства, што прама ці ўскосна аказвала негатыўны ўплыў на падтрыманне экалагічнай раўнавагі. Пры хімізацыі сельскай гаспадаркі асноўнымі прычынамі забруджвання навакольнага асяроддзя з’яўляліся наступныя: страты мінеральных і арганічных угнаенняў пры транспартыроўцы, захаванні і ўнясенні ў глебу; унясенне занадта вялікіх доз арганічных і мінеральных угнаенняў; парушэнне тэхналогіі захоўвання ўгнаенняў; змыў гнаявых сцёкаў і мінеральных угнаенняў у выніку воднай эрозіі; міграцыя элементаў харчавання ў грунтовыя воды; адходы жывёлагадоўчых комплексаў і іх утылізацыя [11]. Наяўнасць вышэйпералічаных фактараў забруджвання было абумоўлена адсутнасцю дзейснага выкарыстання арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў у вырашэнні экалагічных праблем у сельскай гаспадарцы, а таксама экалагічнай непісьменнасцю шматлікіх гаспадарчых кіраўнікоў. Адзначаныя праблемы так і не былі пераадолены да канца перабудовы.

## Спіс літаратуры


1 Навіцкі, У. Зніжэнне тэмпаў развіцця эканомікі. Нарастанне застойных з’яў // Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6: Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.] ; рэд. калегія: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Современная школа, Экоперспектива, 2011. – С. 386–422.

2 Сарокін, А.М. Рэха эпохі крайнасцяў. Беларуская вёска: Ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917–1990-я гады) / А.М. Сарокін. – Мінск : Права і эканоміка, 2005. – 303 с.

3 Шыбека, З.В. Нарыс гісторыі Беларусі (1795 – 2002) / З.В. Шыбека. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2003. – 490 с.

4 Основные направления экономического и социального развития СССР на 1986–1990 годы и на период до 2000 года // Советская Белоруссия. – 1986. – 9 марта. – С. 1–6.

5 Разуваеў, А. На словах і на справе / А. Разуваеў // Запаветы Леніна. – 1989. – 24 кастрычніка. – С. 3.

6 Сныткін, Б. Хто абароніць зямлю і рэкі / Б. Сныткін // Запаветы Леніна. – 1990. –26 ліпеня. – С. 1.

7 Аб’яднаць намаганні // Запаветы Леніна. – 1990. – 18 кастрычніка. – С. 2–3.

8 Пчалінцаў, У. Не ў ладах з экалогіяй / У. Пчалінцаў // Запаветы Леніна. – 1991. – 17 кастрычніка. – С. 3.

9 Пчалінцаў, У. Бочкі замаруджанага дзеяння / У. Пчалінцаў // Запаветы Леніна. – 1991. – 25 снежня. – С. 3.

10 У бюро гаркома КПБ, выканкомах гарадскога і раённага Саветаў народных дэпутатаў // Запаветы Леніна. – 1990. – 3 лютага. – С. 3.

11 Довбан, К.И. Проблемы экологии в интенсивном земледелии и пути их решения / К.И. Довбан. – Минск: БФ ВНИИТЭ, 1990. – 82 с.




РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Y. I. ZAVATSKI*

*ENVIRONMENTAL CONTAMINATION OF THE BSSR DURING PERESTROIKA (ON THE EXAMPLE OF THE ACTIVITIES OF AGRICULTURAL ENTERPRISES OF THE ASIPOWICZY DISTRICT OF THE MAHILIOU REGION)*

*The article deals with the problem of the influence of collective farms and state farms of the Asipowiczy district of the BSSR on nature at the turn of the 1980s–1990s during the period of perestroika. It is concluded that the agricultural enterprises of the studied district had a significant negative impact on nature, which is explained by the non-compliance with the recommended technology for the chemicalization of agriculture and the low ecological culture of economic managers.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ